Весці БДПУ. Серыя 2. 2021. № 4. С. 39–45

*УДК 94:[663.4:633/636](476)«185/191»*

# СУВЯЗЬ БРОВАРНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ З ЗЕМЛЯРОБСТВАМ І ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЕЙ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX – ПАЧАТАК XX ст.)

**А. П. Жытко,**
*доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка;*

**Г. А. Філістовіч,**
*саіскальнік кафедры гісторыі Беларусі і славянскіх народаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

Паступіў у рэдакцыю 19.11.21.

*UDC 94:[663.4:633/636](476)«185/191»*

# CONNECTION OF BREWING INDUSTRY WITH AGRICULTURE AND STOCKBREEDING (THE SECOND HALF OF THE 19th – THE BEGINNING OF THE 20th CENTURY)

**A. Zhitko,**
*Doctor of History, Professor of the Department of History of Belarus and Slavic Nations, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

**H. Filistovich,**
*Applicant of the Department of History of Belarus and Slavic Nations, Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*

Received on 19.11.21

У артыкуле прадметам даследавання з’яўляецца развіццё вінакурнай вытворчасці ў маёнтках памесных дваран Беларусі пасля аграрнай рэформы 1861 г. і да пачатку Першай сусветнай вайны. Пры гэтым увага канцэнтруецца не толькі на дынаміцы броварнай вытворчасці, але і на яе ўплыве на мадэрнізацыю земляробства і жывёлагадоўлі. У такім ракурсе дадзеная праблема вырашаецца ўпершыню ў айчыннай гістарычнай навуцы. Акрамя гэтага, устаноўлены прычыны паступовай трансфармацыі броварнай вытворчасці з саслоўнай у бессаслоўную. Сярод іх найбольш важкімі з’яўляліся агульныя мабілізацыйныя працэсы ў землеўладанні ў парэформенныя гады, а таксама скасаванне ў 1896 г. прапінацыйнага права для памеснага дваранства на вытворчасць і продаж спіртных напояў у сваіх маёнтках.

*Ключавыя словы:* броварная вытворчасць, вінакурня, Беларусь, спірт, земляробства, жывёлагадоўля.

The subject of the research is the development of distilling industry in estates of country nobility of Belarus after the agrarian reform in 1861 and before the beginning of the World War I. The attention is concentrated not only on the dynamics of brewing industry but also on its impact on modernization of agriculture and stockbreeding. The given problem is being solved in domestic history for the first time from this angle. Besides, the reasons of gradual transformation of brewing industry from estate to non-estate are established. Among them the most significant are the general mobilization processes in land ownership in post-reform years as well as the abolition of propination right of estate nobility for industry and selling of spirits in their estates.

*Keywords:* brewing industry, winery, Belarus, alcohol, agriculture, stockbreeding.

*Уводзіны.* Да аграрнай рэформы 1861 г. выключнае права на валоданне населенымі землямі мелі толькі спадчынныя дваране. Буйныя маёнткі памесных дваран уяўлялі сабой кангламерат розных галін вытворчасці. Разам з земляробствам у большасці латыфундыстаў меліся прамысловыя (мануфактуры, млыны, цагельныя, шкляныя, шкіпідарныя, смалакурныя і іншыя заводы, а з 1823 г. – і фабрыкі) і гандлёвыя (карчмы, шынкі) установы. Сярод прамысловых прадпрыемстваў вядучая роля належала вінакурным заводам, якія меліся ў большасці маёнткаў.

У парэформенны перыяд на тэрыторыі Беларусі адной з галін прамысловай вытворчасці ў памешчыцкіх гаспадарках было вінакурства. Яно было цесна звязана з жывёлагадоўлей і земляробствам. Вінакурства давала спірт, які меў значны збыт, і барду на адкорм жывёлы. Бровары ў Беларусі адносіліся да трэцяй і другой катэгорыі, гэта значыць, былі дробнымі (85,7 %) і сярэднімі (14,3 %). На апошніх вытворчасць бязводнага спірту не дасягала 40 000 вёдзер у год [1, с. 167]. Звычайна на вінакурных заводах былі задзейнічаны 1 магістар і 5–7 (за рэдкім выключэннем – 12–18) рабочых. У адпаведнасці з данымі за 1890 г. на 376 заводах у 5 беларускіх губернях працавала 2900 рабочых, альбо ў сярэднім па 7–8 чалавек на кожным з іх [2, с. 110].

Пасля скасавання прыгону адбылося значнае скарачэнне колькасці бровараў як у цэлым па імперыі, так і асабліва ў беларускіх губернях. Так, калі ў 50 губернях Еўрапейскай Расіі колькасць бровараў з 1862/1863 да

1867/1868 гг. паменшылася ў 1,4 разы, то ў 5 беларускіх губернях – у 2,1 разы. Скарачэнне колькасці такіх заводаў у Беларусі працягвалася да 1900 г. і склала 428 (табліца 1).

**Табліца 1. – Дынаміка броварнай вытворчасці [2, с. 111, 114, 115; 3, с. 188, 189]**

| Губерні | Колькасць заводаў | Перакурана хлебных прыпасаў (пудоў) | перакурана бульбы (пудоў) | % перакуранай бульбы | выкурана вёдзер 100° спірту* | Колькасць заводаў | Перакурана хлебных прыпасаў (пудоў) | перакурана бульбы (пудоў) | % перакуранай бульбы | выкурана вёдзер 100° спірту |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1862–1863 гг. | | | | | 1867–1868 гг. | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| Віленская | 171 | 892097 | 344653 | 27,9 | 345087 | 114 | 975129 | 546595 | 35,9 | 420827 |
| Віцебская | 142 | 611710 | 500 | 0,08 | 220266 | 69 | 496395 | 1020 | 0,2 | 183916 |
| Гродзенская | 200 | 623206 | 3020609 | 82,9 | 557975 | 123 | 348675 | 1368744 | 79,9 | 451544 |
| Мінская | 346 | 1033667 | 1789272 | 63,3 | 565779 | 147 | 1200319 | 703776 | 36,9 | 501714 |
| Магілёўская | 255 | 1241353 | 164958 | 11,7 | 460618 | 69 | 1014375 | 1500 | 0,2 | 389705 |
| Разам | 1114 | 4402033 | 5319992 | 54,7 | 2149725 | 522 | 4034893 | 2621635 | 39,3 | 1947706 |
| | 1880–1881 гг. | | | | | 1899–1900 гг. * | | | | |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| Віленская | 89 | 465733 | 1259147 | 73,0 | 322507 | 73 | 744369 | 280039 | 79,0 | 167910 |
| Віцебская | 50 | 317040 | 43918 | 12,0 | 129975 | 32 | 157770 | 691558 | 81,4 | 401574 |
| Гродзенская | 89 | 333572 | 2586120 | 88,5 | 447075 | 71 | 277084 | 3512765 | 92,7 | 1552469 |
| Мінская | 132 | 543419 | 2596819 | 82,7 | 536575 | 153 | 1120700 | 5942709 | 84,1 | 3279928 |
| Магілёўская | 78 | 575749 | 382314 | 39,9 | 275046 | 99 | 631411 | 3262221 | 83,9 | 1780549 |
| Разам | 438 | 2235513 | 6868318 | 75,4 | 1711175 | 428 | 2913493 | 16217292 | 84,6 | 8686430 |
| | 1906–1907 гг. | | | | | 1910–1911 гг. | | | | |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | 32 | 33 |
| Віленская | 98 | 862835 | 4372751 | 83,5 | 2412964 | 102 | 458847 | 5830503 | 92,7 | 2573918 |
| Віцебская | 40 | 169761 | 1095936 | 86,6 | 548798 | 44 | 104854 | 1615237 | 93,9 | 663293 |
| Гродзенская | 94 | 367879 | 5709723 | 93,9 | 2449564 | 103 | 390059 | 6985332 | 94,7 | 2958810 |
| Мінская | 206 | 1233921 | 8887274 | 97,8 | 4393923 | 229 | 820647 | 13104240 | 94,1 | 5696696 |
| Магілёўская | 136 | 639331 | 6148722 | 90,6 | 2779023 | 150 | 451177 | 7772173 | 94,5 | 3227417 |
| Разам | 574 | 3273727 | 26214406 | 88,9 | 12584272 | 628 | 2225884 | 35307485 | 94,1 | 15120134 |

* У 1899–1900 гг. улік выкуранага спірту вёўся ў 40°.

На рэзкае скарачэнне колькасці бровараў на тэрыторыі Беларусі ў пачатку 60-х гг. XIX ст. паўплывалі прычыны як агульна імперскага характару, так і сацыяльна-эканамічная і палітычная сітуацыя ў краі. Да агульных неабходна аднесці няздольнасць памеснага дваранства перабудаваць сваю гаспадарку на капіталістычныя рэйкі. Выкупная аперацыя па аграрнай рэформе 1861 г. адмоўна паўплывала на стан не толькі сялянскай, але і памешчыцкай гаспадаркі. Акрамя гэтага, з 1 студзеня 1863 г. замест адкупной сістэмы ўводзіўся збор ускосных падаткаў (акцызаў) на прадукты вінакурнай вытворчасці. У беларускіх губернях сітуацыя ўсугублялася пераводам сялян з 1863 г. на абавязковы выкуп, што ліквідавала іх часоваабавязаны стан. Тым самым памешчыкі лішыліся дармавой рабочай сілы. Акрамя гэтага, канфіскацыі маёнткаў і секвестр прадугледжвалі пераход памесцяў удзельнікаў паўстання 1863–1864 гг. у распараджэнне казны з іх далейшым распродажам ці аддачай іх у арэнднае карыстанне. Бровары ў такіх маёнтах з цягам часу прыпынялі сваю дзейнасць. Дзесяціпрацэнтны збор з даходаў памесных дваран-католікаў падрываў броварную вытворчасць у прыватнасці і гаспадарку наогул.

На падставе «Положения о питейном сборе» ад 4 ліпеня 1861 г. [4] стваралiся губернскія і акруговыя акцызныя ўпраўленні па зборы ўскосных падаткаў з заводаў па вытворчасці моцных напояў. Пры гэтым ускосныя падаткі з вырабу спірту, вытворчасці табаку (з 1865 г.), солі (з 1866 г.) і іх продажу давалі амаль адну трэць усіх мясцовых дзяржаўных даходаў у беларускіх губернях. Гэтаму садзейнічала і ліквідацыя ў 1897 г. прапінацыйнага права (выключнага права памесных дваран на продаж спіртных напояў) у заходніх губернях. З гэтага часу ўводзіўся казённы продаж гарэлкі [5].

У адпаведнасці з Палажэннем ад 4 ліпеня 1861 г. завод павінен быў вырабляць не менш 540 вёдзер бязводнага спірту ў год, уводзіліся безупынна дзейнічаючыя перагонныя апараты, а з 1870 г. – кантрольныя прыборы для ўліку атрыманага спірту [6, с. 244]. Да таго ж пастаянна павялічваўся акцызны збор з аднаго градуса атрыманага спірту, які ў 1863 г. складаў 4 кап., у 1864 г. – 5, 1869 г. – 6, 1874 г. – 7, 1881 г. – 8 і з 1892 г. – 10 кап. [1, с. 165]. Зразумела, што дробныя бровары зачыняліся, а ўвядзенне новых у 60–70-х гг. XIX ст. было рэдкай з'явай. У той жа час вытворчасць спірту з 1862/1863 да 1899/1900 гг. павялічылася ў 1,6 раза. Відавочна, гэта было звязана з растучай канцэнтрацыяй вінакурнай вытворчасці і тэхнічным пераўзбраеннем бровараў. Разам з тым падлікі Л. П. Ліпінскага аб колькасці выкуранага спірту ў гэтыя гады не адпавядаюць рэчаіснасці. Справа ў тым, што ў папярэднія гады памер атрыманага спірту ацэньваўся ў 100°, а пачынаючы з 1899/1900 гг., – у 40°. Таму рэальна ў гэтым годзе было атрымана не 8 686 430 вёдзер спірту, а 3 474 572 вядры з улікам 100° спірту, што перавысіла вытворчасць 1862/1863 гг. толькі ў 1,6 разы, а не ў 4, як у Л. П. Ліпінскага. Ёсць і іншыя метады аналізу статыстычных даных, якія пацвярджаюць нашы высновы. Вядома, што выхад спірту з 1 пуда хлебных прыпасаў складаў ад 0,35 да 0,37 вядра, а з 1 пуда бульбы – ад 0,09 да 0,11 [6, с. 244]. Калі перамножыць колькасць перакураных хлебных прыпасаў і бульбы на адпаведныя паказчыкі, а суму на 2,5, то атрымаем колькасць вёдзер 40° спірту, які ўказаны Л. П. Ліпінскім у 1899/1900 г.

Толькі з пачатку XX ст. наглядаўся рост колькасці бровараў. У 5 беларускіх губернях яна павялічылася з 428 у 1899/1900 гг. да 574 – у 1906/1907 гг. і да 628 – у 1910/1911 гг., альбо ў 1,47 раза ў параўнанні з 1899/1900 гг., а вытворчасць 40° спірту – у 1,74 раза (табліцы 1, 2).

**Табліца 2. – Дынаміка броварнай вытворчасці ў 1906/1907–1910/1911 гг. [3, с. 188–189]**

| Губерні | Гады | Усяго заводаў | З іх дражджавых | Колькасць перапрацаваных прыпасаў (пудоў) | | | Колькасць выкуранага 40 °спірту (вёдзер) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Хлебных | бульбы | патакі і іншых прадуктаў | |
| Віленская | 1906/1907 | 98 | 8 | 830155 | 4372751 | 32680 | 2412964 |
| | 1907/1908 | 101 | 7 | 659828 | 4951884 | 147430 | 2770540 |
| | 1908/1909 | 101 | 6 | 410973 | 4947202 | 48196 | 2251725 |
| | 1909/1910 | 101 | 4 | 361408 | 4351815 | 12960 | 1946653 |
| | 1910/1911 | 102 | 5 | 445247 | 5830503 | 13600 | 2573978 |
| Віцебская | 1906/1907 | 40 | – | 169761 | 1095936 | – | 548798 |
| | 1907/1908 | 42 | – | 116481 | 1595955 | – | 690783 |
| | 1908/1909 | 42 | – | 203041 | 1169845 | – | 591708 |
| | 1909/1910 | 43 | – | 17639 | 964628 | – | 518356 |
| | 1910/1911 | 44 | – | 104854 | 1615237 | – | 663293 |
| Гродзенская | 1906/1907 | 94 | 3 | 357666 | 5709723 | 10213 | 2449564 |
| | 1907/1908 | 96 | 3 | 434511 | 4667569 | 20182 | 2197857 |
| | 1908/1909 | 103 | 3 | 389008 | 6041778 | 20239 | 2648313 |
| | 1909/1910 | 104 | 2 | 319552 | 5724919 | 15060 | 2503435 |
| | 1910/1911 | 103 | 2 | 380715 | 6985332 | 9344 | 2958010 |
| Мінская | 1906/1907 | 206 | 4 | 1233921 | 8887274 | – | 4393923 |
| | 1907/1908 | 209 | 5 | 849394 | 10516414 | 12252 | 4863574 |
| | 1908/1909 | 220 | 4 | 781132 | 11497415 | – | 5018097 |
| | 1909/1910 | 225 | 6 | 771989 | 12137843 | – | 5400098 |
| | 1910/1911 | 229 | 5 | 820947 | 13104240 | – | 5699696 |

| Губерні | Гады | Усяго заводаў | З іх дражджавых | Колькасць перапрацаваных прыпасаў (пудоў) | | | Колькасць выкуранага 40 °спірту (вёдзер) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Хлебных | бульбы | патакі і іншых прадуктаў | |
| Магілёўская | 1906/1907 | 136 | 2 | 639331 | 6148722 | – | 2779023 |
| | 1907/1908 | 139 | 2 | 455783 | 7112388 | – | 3132360 |
| | 1908/1909 | 142 | 1 | 546318 | 6707599 | – | 2997809 |
| | 1909/1910 | 152 | 2 | 398272 | 7118696 | – | 3160408 |
| | 1910/1911 | 150 | 2 | 451177 | 7772173 | – | 12584272 |
| Разам | 1906/1907 | 574 | 17 | 3230864 | 26214406 | 42763 | 12584272 |
| | 1907/1908 | 587 | 17 | 2515997 | 28844210 | 179864 | 13655109 |
| | 1908/1909 | 608 | 14 | 2330472 | 30363839 | 68435 | 13507652 |
| | 1909/1910 | 625 | 14 | 2036683 | 30297901 | 28020 | 13528950 |
| | 1910/1911 | 628 | 14 | 2202940 | 35307485 | 22944 | 15120134 |

Гэта сведчанне далейшага ўзбуйнення як саміх заводаў, так і ўдасканалення тэхналагічных працэсаў. Так, у Гродзенскай губ. за 1900–1913 гг. былі заснаваны 33 новыя бровары, аснашчаныя новым абсталяваннем, што складала 33 % ад усіх дзейнічаўшых [7, арк. 144–184] (табліца 3).

**Табліца 3. – Гады заснавання бровараў у беларускіх паветах Гродзенскай губ. [7, арк. 144–184]**

| Да 1861 г. | 1860-я | 1870-я | 1880-я | 1890-я | 1900–1907 гг. | 1908–1913 гг. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 23 | 19 | 4 | 4 | 16 | 25 | 8 |

Хуткі рост колькасці бровараў быў выкліканы і законам ад 4 чэрвеня 1890 г., па якім завод мог быць заснаваны пры наяўнасці не менш 60 дзес. ворнай зямлі пры маёнтку, а сам памер завода залежаў ад плошчы ворыва. Зразумела, што гэты закон задавальняў буйных латыфундыстаў і стымуляваў развіццё земляробства. Так, у 1910/1911 г. пры памешчыцкіх броварах была ўжо значная колькасць ворнай зямлі, якая вагалася ў сярэднім на адзін завод ад 481 дзес. у Віцебскай губ. да 669 – у Гродзенскай [3, с. 188, 189].

Па колькасці заводаў і выкуранага спірту Мінская губ. увесь парэформенны перыяд займала першае месца. Так, у 1862/1863 гг. на яе долю прыпадала 31,1 % бровараў і 26,3 % спірту, а ў 1910/1911 гг. адпаведна – 36,5 % і 37,7 %. Затым ішла Магілёўская губ. (23,9 % заводаў и 21,3 % вытворчасці спірту). На Гродзенскую і Віленскую губерні прыпадала 103 і 102 заводы, але ў Гродзенскай губ. іх магутнасць была крыху вышэйшай. Тут выхад спірту склаў 19,6 %, а ў Віленскай губ. – 17,0 % ад выразбленага ў 1910/1911 г. у 5 беларускіх губернях (табліцы 1, 2).

Што тычыцца развіцця вінакурства на сучаснай тэрыторыі Беларусі, то нейкае ўяўленне аб гэтым дае табліца 4.

**Табліца 4. – Гады заснавання дваранскіх бровараў на тэрыторыі Беларусі [8, с. 480–490; 509–516; 574–586]**

| Губерні | да 1861 г.* | 1860-я | 1870-я | 1880-я | 1890–1901 гг. | Разам |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Віленская (4 паветы) | 17 | 1 | 2 | 14 | 16 | 50 |
| Віцебская (5 паветаў) | 8 | – | 2 | 2 | 7 | 19 |
| Гродзенская (6 паветаў) | 27 | 6 | 3 | 16 | 19 | 71 |
| Мінская | 11 | 2 | 4 | 14 | 29 | 60** |
| Магілёўская | 19 | 6 | 15 | 16 | 45 | 101 |
| Разам | 82 | 15 | 26 | 62 | 116 | 301 |

* У графу да 1861 г. уключаны і бровары, год заснавання якіх невядомы.

** У Мінскай губерні, акрамя 60 дваранскіх бровараў, дзейнічала звыш 90 бровараў, якія належалі прадстаўнікам іншых саслоўяў.

У 1901/1902 гг. у 35 беларускіх паветах дзейнічаў 301 дваранскі бровар, ці 70,3 % ад іх агульнай колькасці ў 5 паўночна-заходніх губернях. З іх агульнай колькасці 116, ці 38,5 % былі заснаваны ў 1890–1900 гг. падчас эканамічнага пад'ёму, які супаў з прамысловай рэвалюцыяй у Беларусі. На 301 бровары працавалі 2485 рабочых, альбо ў сярэднім па 8–9 чалавек на кожным з бровараў. Гадавая сума вытворчасці спірту толькі на дваранскіх броварах склала 5049,7 тыс. руб. Трэба мець на ўвазе, што намі не ўлічаны бровары, якія разам з дваранскімі маёнткамі перайшлі ў рукі іншых саслоўяў. Гэтаму пераходу садзейнічала адмена прапінацыйнага права (выключнае права памесных дваран на вытворчасць і продаж спіртных напояў у межах сваіх маёнткаў) у 1896 г. Тым самым вінакурная вытворчасць пастуова пераўтваралася ў бессаслоўную, што стымулявала развіццё капіталістычных адносін у краі.

Сярод паветаў Мінскай губ., дзе сума гадавой вытворчасці перавышала 1 млн руб., першае месца ў пачатку XX ст. займаў Рэчыцкі павет (2,7 млн руб.). Затым ішлі Слуцкі – 2,0 млн руб., Бабруйскі – 1,95, Навагрудскі – 1,6, Пінскі – 1,2 і Мінскі павет – 1,1 млн руб. [9, с. 290].

Фармальна абсалютная большасць бровараў належала памесным дваранам. Аднак на самой справе значная частка іх здавалася ў арэнду, звычайна яўрэям ці беззямельным дваранам каталіцкага веравызнання. Так, у Магілёўскай губ. у 1880 г. з 75 бровараў дваранам належала 73 (97,3 %), з якіх 48 прыпадала на долю католікаў, а 25 – праваслаўных і лютэран. З 73 бровараў у арэндзе яўрэяў было 34, а ў дваран – 4 [6, с. 196–202]. На пачатку XX ст. пасля аслаблення некаторых абмежавальных юрыдычных актаў адносна набыцця зямлі яўрэямі апошнія пастуова станавіліся не толькі арэндатарамі бровараў, але і іх уласнікамі. Так, у 1913/1914 гг. у Гродзенскай губ. з 99 вінакурных заводаў 13 належала яўрэям на праве ўласнасці [7, арк. 68–73].

Акрамя гэтага, на тэрыторыі беларускіх губерняў рэальна дзейнічаўшых бровараў было значна больш, чым па даных акцызнага ведамства. Існавалі тайныя бровары, якія належалі ў асноўным яўрэям. Асабліва гэта праявілася ў Гродзенскай і Віленскай губернях. Такая іх дзейнасць набыла рэпутацыю «акадэміі махлярства» [10, арк. 3]. Толькі з 1877 па 1887 г. тут было ліквідавана 507 тайных бровараў, а ў Гродзенскай губ. кожны год выяўлялася па 3–5 такіх бровараў [10, арк. 5, 9].

Сыравінай для вінакурства з'яўляліся хлебныя прыпасы і бульба. Да 1881/1882 гг. большасць спірту выкурвалася са збожжавых культур, але з адзначанага часу бульба пастуова пачала іх выцясняць. Хаця працэнт перакуранай бульбы ў 1862/1863 гг. і перавышаў колькасць хлебных прыпасаў, але выхад спірту з аднаго пуда бульбы быў у 3–4 разы меншым. Таму менавіта перыяд 1880/1881 гг. з'явіўся пераломным. На гэта паўплывала і значнае пашырэнне пасяўной плошчы пад бульбу. Так, у Віленскай губерні з 1881 па 1889 г. плошча пад бульбай пашырылася ў 2,3, Гродзенскай – у 1,9, Мінскай – у 2,1, Магілёўскай – у 4,7 разы. Нягледзячы на значнае скарачэнне дваранска-памешчыцкага землеўладання, у пачатку XX ст. агульныя плошчы пад пасевамі бульбы павялічваліся. Бульбяны клін у 1900 г. у беларускіх губернях складаў 133,8 тыс. дзес. зямлі, а ў 1913 г. – ужо 204,9 тыс. дзес. Удзельная ж вага бульбы ў агульным пасеве склала ў 1900 г. 9,8, а ў 1913 – 15,4 % [11, с. 138, 139]. Гэта сведчыць аб тым, што прыватныя ўласнікі, галоўным чынам памешчыкі, нягледзячы на пераход значнай часткі зямлі ў рукі сялян, імкнуліся ўтрымаць ворныя землі, пераходзілі да шматпольнай сістэмы за кошт скарачэння папару і некаторых традыцыйных збожжавых культур, якія давалі меншы прыбытак. Так, у 80-х гг. XIX ст. гэты прыбытак ад вырошчвання жыта складаў 8,7 руб. з адной дзесяціны, аўса – 5,3, ячменю – 11,5, а бульбы – 57,9 руб. [12, с. 338, 340]. Акрамя гэтага, было ўстаноўлена, што выхад спірту з 1 дзес. бульбы быў значна большы ў параўнанні з 1 дзес. збожжавых. Так, з 1 дзес. жыта выхад бязводнага спірту складаў 26,3 вядра, а бульбы – 78,9 вядры, ці ў 3 разы больш [13, с. 105].

Культываванне вырошчвання бульбы прывяло да пашырэння шматпольнай сістэмы не толькі ў памешчыцкай, але і сялянскай гаспадарак. Акрамя гэтага, вырошчванне бульбы стымулявала тэхналагічную рэвалюцыю ў земляробстве. На змену сахі прыйшлі жалезныя плугі, бараны, культыватары, акучнікі, глебапаглыбнікі, бульбакапалкі і іншыя механізмы. Пашырэнне вырошчвання бульбы вымагала ашчадных адносін да зямлі. Памешчыкі павялічвалі статкі жывёлы з мэтай атрымання арганічнага ўгнаення,

што садзейнічала развіццю жывёлагадоўлі ў краі. Акрамя гэтага, для вырошчвання бульбы патрабаваліся мінеральныя ўгнаенні, сярод якіх значнае месца займалі суперфасфат, калій, салетра. Усе гэта садзейнічала пашырэнню таварна-грашовых адносін, развіццю прамысловасці па вырабе сельскагаспадарчых прылад працы і навейшага абсталявання для бровараў.

Броварная вытворчасць стымулявала і развіццё жывёлагадоўлі. На адыходах ад вінакурэння адкормлівалася буйнарагатая жывёла на продаж. Так, у 60-х гг. XIX ст. толькі на броварах Пружанскага павета на адыходах ад вінакурэння адкормлівалася звычайна па 20–40 галоў жывёлы на кожным з іх. Сучаснікі адзначалі, што «адкормленыя брагаю быкі адпраўляюцца часткова ў Варшаву і ў Вільню па 60–90 руб. за галаву, большай жа часткай – на мясцовы ўбой» [14, с. 89].

Адкорм буйной рагатай жывёлы практыкаваўся і ў іншых губернях Беларусі. Так, мінскі губернатар неаднаразова падкрэсліваў, што «ў маёнтках з броварамі нярэдка ўтрымліваецца лішак уласнай жывёлы ці чужой з платаю за яе ўтрыманне з мэтай адкорму і продажу на ўбой у гарады» [15, с. 25, 26]. У прыватнасці, рэчыцкі памешчык А. Горват яшчэ з пачатку 60-х гг. практыкаваў адкорм валоў, якіх закупляў на Украіне. Адкормленыя валы дастаўляліся у Пецярбург і прыносілі штогод да 40 тыс. руб. прыбытку [16, с. 74].

У 80–90-х гг. XIX ст. адкорм і выпас буйной рагатай жывёлы набылі далейшае развіццё, дзе дзейнічалі бровары і мелася значная колькасць лугоў і пашы. Выпас практыкаваўся з вясны да восені, а на адкорм на броварах жывёлу ставілі з восені да вясны. У сярэдзіне 90-х гг. XIX ст. па ініцыятыве памешчыкаў Мінскай губ. упраўляючы Мінскім аддзяленнем Дзяржаўнага банка паставіў пытанне аб адкрыцці крэдыту на 6–8 месяцаў для тых гаспадароў, што займаліся гэтай дзейнасцю. І на пачатку XX ст. у маёнтках, дзе дзейнічалі бровары, па-ранейшаму практыкаваўся адкорм як памешчыцкай жывёлы, так і жывёлапрамыслоўцаў, якія звычайна ўвосень скупалі па нізкіх цэнах сялянскую жывёлу [17, с. 13]. Так, у 1909 г. на адкорме жывёла ўтрымлівалася пры 221 бровары. У 1901–1908 гг. штогод на броварах адкормлівалася 15–16 тыс., а на выпасе – 14–15 тыс. галоў буйной рагатай жывёлы. У 1913 г. з беларускіх губерняў толькі вываз па чыгунцы склаў 54,4 тыс. галоў буйной рагатай жывёлы [16, с. 206, 207].

*Заключэнне.* На тэрыторыі Беларусі з 1861 па 1900 г. наглядаўся працэс скарачэння колькасці бровараў. Ён быў парушаны ў пачатку XX ст. Пры гэтым неабходна мець на ўвазе, што памяншэнне колькасці бровараў адбывалася, у асноўным, за кошт дробных, якія не адпавядалі прынятым заканадаўчым нормам. Нягледзячы на колькасны спад, вытворчасць спірту з канца 80-х гг. XIX ст. перавысіла паказчыкі 1862 г. З 1900 да 1911 г. лік вінакураных заводаў павялічыўся на 200 адзінак. Вінакурэнне цесным чынам было звязана з сельскагаспадарчай сферай. Яно садзейнічала пераходу ад трохпольнай да шматпольнай сістэмы ў земляробстве, развіццю жывёлагадоўлі і гандлю мясапрадуктамі.

Літаратура

1. Вся Россия : Рус. кн. пром-сти, торговли, сел. хоз-ва и администрации : Торг.-пром. адрес-календарь Рос. империи... / под ред. А. С. Суворина. – СПб., 1895. – Т. 2. – 826 с.
2. *Липинский, Л. Г.* Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (вторая половина XIX в.) / Л. Г. Липинский. – Минск : Наука и техника, 1971. – 254 с.
3. Сборник статистико-экономических сведений по сельскому хозяйству России и иностранных государств... / М-во земледелия. Отд. сел. экономии и с.-х. статистики. Год шестой. – СПб., 1913. – XIV, 601 с.
4. Полное собрание законов Российской империи (далей ПСЗРИ). – 2-е. собр. – Т. 37. – № 37197.
5. ПСЗРИ. – 2-е. собр. – Т. 40. – № 42180.
6. Опыт описания Могилевской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях.. : В 3 кн. : Сост. по прогр. [с предисл.] и под ред. А. С. Дембовецкого. Кн. 1. – Могилев-на-Днепре : тип. Губ. правл., 1882. – 782 с.

References

1. Vsya Rossiya : Rus. kn. prom-sti, torgovli, sel. hoz-va i administracii : Torg.-prom. adres-kalendar' Ros. imperii... / pod red. A. S. Suvorina. – SPb., 1895. – T. 2. – 826 s.
2. *Lipinskij, L. G.* Razvitie kapitalizma v sel'skom hozyajstve Belorussii (vtoraya polovina HIH v.) / L. G. Lipinskij. – Minsk : Nauka i tekhnika, 1971. – 254 s.
3. Sbornik statistiko-ekonomicheskih svedenij po sel'skomu hozyajstvu Rossii i inostrannyh gosudarstv... / M-vo zemledeliya. Otd. sel. ekonomii i s.-h. statistiki. God shestoj. – SPb., 1913. – XIV, 601 s.
4. Polnoe sobranie zakonov Rossijskoj imperii (dalej PSZRI). – 2-e. sobr. – T. 37. – № 37197.
5. PSZRI. – 2-e. sobr. – T. 40. – № 42180.
6. Opyt opisaniya Mogilevskoj gubernii v istoricheskom, fiziko-geograficheskom, etnograficheskom, promyshlennom, sel'skohozyajstvennom, lesnom, uchebnom, medicinskom i statisticheskom otnosheniyah.. : V 3 kn. : Sost. po progr. [s predisl.] i pod red. A. S. Dembovеckogo. Kn. 1. – Mogilev-na-Dnepre : tip. Gub. pravl., 1882. – 782 s.

7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей – НГБА у г. Гродна). – Ф. 30. Воп. 1. Спр. 518.
8. Падлічана: Список фабрик и заводов Европейской России / Министерство финансов. – СПб. : тип. В. Киршбаума, 1903. – 838, [1] с.
9. Россия : полное географическое описание нашего отечества : настольная и дорожная книга для русских людей : т. 1-19 / под ред. В. П. Семенова и под общ. руководством П. П. Семенова, вице-пред. Имп. Русского геогр. о-ва и проф. В. И. Ламанского, пред. Отд-ния этнографии Имп. Русского геогр. о-ва. Т. 9 : Верхнее Поднепровье и Белоруссия : [Смоленская, Могилевская, Витебская и Минская губернии] / сост.: В. П. Семенов, М. В. Довнар-Запольский, Д. З. Шендрик [и др. ; предисл.: В. Семенов]. – СПб. : тип. А. Ф. Девриена, 1905. – VII, 619.
10. НГБА у г. Гродна. – Ф. 1. Воп. 9. Спр. 1388.
11. Экономика Белоруссии в эпоху империализма. 1900–1917 [Текст] / Акад. наук БССР. Ин-т экономики ; [Под ред. Г. Т. Ковалевского и др.]. – Минск : Изд-во Акад. наук БССР, 1963. – 422 с.; 22 см.
12. Сельское и лесное хозяйство России. – СПб. : Деп. земледелия и сельской промышленности М-ва гос. имуществ, 1893. – II, XXVI, 647 с. : ил., карты.
13. Сборник сведений по истории и статистике внешней торговли России / под ред. В. И. Покровского. Т. 1 : Очерк истории внешней торговли России ; Отпуск и привоз товаров в XIX столетии ; Таблицы отпуска, привоза и таможенных доходов. – 1902. – [670] с. разд. паг.
14. Несколько сведений о современном состоянии сельского хозяйства и промыслов в Гродненской губернии. – Гродно : Гродн. Стат. Ком., 1872. – [1], 165 с.
15. Приложение к всеподданейшему отчету Минского губернатора за 1875 г. Минск : Губ. тип, 1876. – 160 с.
16. *Бейлькин, Х. Ю.* Сельскохозяйственный рынок Белоруссии, 1861–1914 гг. / Х. Ю. Бейлькин. – Минск : Наука и техника, 1989. – 288 с.
17. Памятная книжка Виленской губернии на 1913 год. – Вильна : Губерн. тип., 1913. – Ч. 2. – 111 с.

7. Nacyyanal'ny gistarychny arhiў Belarusi ў g. Grodna (dalej – NGBA u g. Grodna). – F. 30. Vop. 1. Spr. 518.
8. Padlichana: Spisok fabrik i zavodov Evropejskoj Rossii / Ministerstvo finansov. – SPb. : tip. V. Kirshbauma, 1903. – 838, [1] s.
9. Rossiya : polnoe geograficheskoe opisanie nashego otechestva : nastol'naya i dorozhnaya kniga dlya russkih lyudej : t. 1-19 / pod red. V. P. Semenova i pod obshch. rukovodstvom P. P. Semenova, vice-pred. Imp. Russkogo geogr. o-va i prof. V. I. Lamanskogo, pred. Otd-niya etnografii Imp. Russkogo geogr. o-va. T. 9 : Verhnee Podneprov'e i Belorussiya : [Smolenskaya, Mogilevskaya, Vitebskaya i Minskaya gubernii] / sost.: V. P. Semenov, M. V. Dovnar-Zapol'skij, D. Z. Shendrik [i dr. ; predisl.: V. Semenov]. – SPb. : tip. A. F. Devriena, 1905. – VII, 619.
10. NGBA u g. Grodna. – F. 1. Vop. 9. Spr. 1388.
11. Ekonomika Belorussii v epohu imperializma. 1900–1917 [Tekst] / Akad. nauk BSSR. In-t ekonomiki ; [Pod red. G. T. Kovalevskogo i dr.]. – Minsk : Izd-vo Akad. nauk BSSR, 1963. – 422 s.; 22 sm.
12. Sel'skoe i lesnoe hozyajstvo Rossii. – SPb. : Dep. zemledeliya i sel'skoj promyshlennosti M-va gos. imushchestv, 1893. – II, XXVI, 647 s. : il., karty.
13. Sbornik svedenij po istorii i statistike vneshnej torgovli Rossii / pod red. V. I. Pokrovskogo. T. 1 : Ocherk istorii vneshnej torgovli Rossii ; Otpusk i privoz tovarov v XIX stoletii ; Tablicy otpuska, privoza i tamozhennyh dohodov. – 1902. – [670] s. razd. pag.
14. Neskol'ko svedenij o sovremennom sostoyanii sel'skogo hozyajstva i promyslov v Grodnenskoj gubernii. – Grodno : Grodn. Stat. Kom., 1872. – [1], 165 s.
15. Prilozhenie k vsepoddanejshemu otchetu Minskogo gubernatora za 1875 g. Minsk : Gub. tip, 1876. – 160 s.
16. Bejl'kin, H. Yu. Sel'skohozyajstvennyj rynok Belorussii, 1861–1914 gg. / H. Yu. Bejl'kin. – Minsk : Nauka i tekhnika, 1989. – 288 s.
17. Pamyatnaya knizhka Vilenskoj gubernii na 1913 god. – Vil'na : Gubern. tip., 1913. – Ch. 2. – 111 s.